УДК 9(476)

# Фарміраванне ідэалогіі і ідэалагічных інстытутаў Расійскай імперыі ў XVIII ст. – пач. XIX ст.

Багдановіч А. І.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт.

У дакладзе, агучаным на канферэнцыі быў разгледжаны працэс фарміравання ідэалогіі Расійскага самадзяржаўя які пачаўся ў XIV ст. і прайшоў шлях ад лозунгаў Святая Русь і Масква – трэці Рым, да адзінай і непадзельнай Русі і неабходнасці ўкаранення ў свядомасць народа лозунга “Праваслаўе. Самадзяржаўе. Народнасць.”, які да канца існавання Расійскай імперыі вызначаў сутнасць яе ідэалогіі.

Адзіным сродкам правядзення ідэалгічнай работы з XIV ст. і да пачатку XVIII ст. заставалась праваслаўная царква якая ў часы патрыярха Нікана дасягнула найвышэйшай сваёй палітычнай магутнасці. У пачатку XVIII ст. для Пятра 1, царква становіцца перашкодай у ажыццяўленні свайго адзінаўладдзя. Таму ён пасля смерці патрыярха Адрыяна не дапусціў выбараў новага а на чале царквы паставіў Свяцейшы Сінод – калегію вышэйшых царкоўных іерархаў, якую ўзначальваў обер-пракурор. Свяцейшы Сінод фактычна становіцца царкоўна-свецкай дзяржаўнай установай, сваеасаблівым міністэрствам па царкоўных справах. У Другая палова XVIII ст. – стала часам, калі побач з царквой фарміруецца такі ідэалагічныя інстытут, як дзяржаўная сістэма адукацыі. Яе пачатак быў пакладены рэфарматарскай дзейнасцю імператрыцы Кацярыны II. Яна не толькі стварыла аснову сістэмы народнай адукацыі але і вызначыла для яе ўзгаданыя ідэалагічныя арыенціры. У 1803 годзе Аляксандрам 1 было створана Міністэрства народнай асветы, якое разам са Свяцейшым сінодам выконвала на працягу XIX ст. ролю вядучых ідэалагічных ведамстваў. У 30-я гады XIX стагоддзя граф С.С. Увараў сфармуляваў асновапалагаючыя ідэалагічныя прынцыпы для сістэмы народнай адукацыі.

Перыядычны друк самаўладдзе таксама спрабуе прыстасаваць для ідэалагічных патрэбаў. У Расійскай імперыі першыя перыядычныя выданні з’явіліся дзякуючы ініцыятыве расійскіх самадзержцаў. Кацярыны II увогуле пачала выдаваць свой часопіс у якім тлумачыла чытачу сутнасць сваёй палітыкі. Аднак далека не ўсе часопісы таго часу жадалі супрацоўнічыць з уладай, многія мелі апазіцыйны характар. Аутарам быў узгаданы шэраг тагачасных перыядычных выданнняў лёс каторых адлюстраваў ідэалагічную барацьбу.

Такім чынам, у XVIII ст. завяршаецца працэс фарміравання ідэалогіі Расійскага самадзяржаўя.